Кожны з іх выбірае для свайго жыцця самыя камфортныя "дамы". Хтосьці селіцца ў лесе або на лузе, хтосьці — на балотах, вадаёмах ці на іх узбярэжжах, а хтосьці любіць жыць побач з пасяленнямі чалавека. Па месцах пражывання размеркаваны і нашы постэры тыповых прадстаўнікоў беларускай фаўны.

І першы госць на старонках "Роднай прыроды" — шэрая чапля.

ЖЫВЁЛЫ ВАДАЁМАЎ І ЎЗБЯРЭЖЖАЎ

Клас — Птушкі
Атрад — Буслападобныя
Сямейства — Чаплевыя

Чапля шэрая
Цапля серая
Ardea cinerea



Фота Юрыя ГОРЫДА

Урок девятнадцатый.

Соседей знать надо



Ведущий — Александр ПИСКУНОВ



Рисунок Олега ПОПОВА

До вечера было далеко, и дядя Петя решил показать Славику лесное озерцо, которое обнаружил неподалеку. Вода в нем словно застыла, и в ней отражался перевернутый лес.

Они подошли ближе. Несколько широких листьев лежало на воде, и среди них, будто фарфоровая, сидела красавица лилия.

— Мертвое озеро, — грустно сказал дядя Петя.

— Химия? — догадался Славик.

— Да нет. Оно не проточное, зимой промерзает. Кислородное голодание. Хотя караси должны быть...

В это время какая-то незнакомая мальчику птица сорвалась с дерева и пронзительно взвизгнула. Дядя Петя насмешливо глянул на Славика:

— Не знал, что дятел кричит? Еще и громко гикает, как разбойник. Разбойник и есть. Гнездо синицы распотрошить, птенцов проглотить ему ничего не стоит.

Славик расстроился. Дятел, этот лесной доктор, уничтожает птенцов... Невозможно даже представить! Мальчик ничего не сказал дяде Пете. Они молча пошли к стоянке.

Солнце к вечеру окончательно исчезло, но дождя не было. Славик заметил, как на одну из прибрежных елей спустилась маленькая бойкая птичка. Мальчик вытащил из-за пазухи бинокль, стараясь поймать ее в окуляр. Круглобокая синичка-гаичка на несколько секунд зависла елочной игрушкой и полетела дальше.

Славик перевел взгляд на озеро. Там плавала серая птица. Туловище ее копенкой поднималось из воды, а большая голова на тонкой шее напоминала кобру с раздутым капюшоном. "Чомга" — догадался Славик. А она плавно скользила по воде, изредка поворачивая голову в разные стороны. Вдруг ткнула клювом в воду и словно потекла всем туловищем вниз, исчезнув даже без всплеска. Вынырнула она метров за пятьдесят от места погружения.

Славик понаблюдал за ныряющей чомгой, а когда встал, чтобы идти к костру, увидел... ежика. Тот стоял, не двигаясь, словно решал, бежать или нет. Мальчик тоже замер. И тут ежик как припустит! Славик пошел к нему. Зверек остановился, присел и начал медленно разворачивать иголки. Затем втянул мордочку и свернулся. Славик снял кепку и с ее помощью перекатил ежа. Тот зашипел недовольно и еще больше сжался. Мальчик отошел. Ему-то любопытно, а ежу страшно. Он уже пожалел, что задержал зверька.

Еж немного полежал, затем как-то незаметно превратился из шара в копенку, из-под которой высунулся нос, и быстро побежал под елочки. Славик заметил, что он ни одной соринки не наколол на колючки. Как только умудрился?

Отец снова хлопотал у костра, втыкая палочки с рыбой.

— Рыба не подведет, это не трава, не грибы, — он словно убеждал остальных. Не мог забыть вылитый суп.

Над озером пронзительно вскрикнула какая-то птица.

— А это кто? — шепотом спросил Славик.

— Не знаю, — отозвался дядя Петя. — Возможно, кулик какой-нибудь, кроншнеп... — Он помолчал немного. — Мне всегда хотелось узнавать "в лицо" — по виду, по полету, по голосу — птиц и зверей. Особенно птиц. Идешь себе в лесу и примечаешь: горихвостка перепорхнула, конек пискнул, рябчик самочку позвал, подорлик парит в небе, синица-ополовник по веткам шныряет... Кажется, если будешь знать всех, большой смысл в лесной жизни откроется: и погоду сможешь предсказать, и грибы-ягоды всегда найдешь, и не заблудишься, и время определишь. И вообще интересно... Это как идти по городу, равнодушно пропуская мимо глаз сотни прохожих. И совсем другое дело — по деревне: это Иван, мастер-столяр; это Николай, гармонист известный; это Илья, шутник — животики надорвешь... Всем поклон, всем привет. От встречи с каждым что-то в памяти остается.

— Да, хорошо бы всех птиц узнавать, — согласился Славик. — Да как их запомнишь — маленькие все, мельтешат...

— Неграмотному тоже все буквы кажутся одинаковыми, — усмехнулся отец. — Учи наизусть, как азбуку, тогда и будешь знать.


Они замолчали. Начали разбирать горячую рыбу, грызть сухари, запивая кисловатым черничным компотом...

Вока, Комета и тайны Красной книги 6









Художник Александр КОРШАКЕВИЧ

Открытка «Окошко в лето»

Июльской порой хорошо прогуляться по берегу речки, набрать букет прибрежных цветов, побросать камешки в воду или просто полюбоваться блеском волн. Вот бы зимой было такое волшебное окошко, в которое выглянешь — и речка перед тобой, и камыши, и даже теплом веет!.. А давайте немного поколдуем и сделаем себе настоящее окно в лето.

Нам понадобятся:

- листок акварельной бумаги формата А5;
- листок крафт-бумаги чуть меньшего размера;
- блистеры от упаковок (в таких обычно продаются товары для творчества);
- засушенные растения, камешки, речной песок, кусочек ваты;
- акварельные краски;
- кисть;
- карандаш;
- линейка;
- ножницы;
- канцелярский нож;
- термоклей.



1 Делаем основу открытки: на белом листе карандашом отмечаем, где будет приклеен крафт-листок.


2 На крафт-листке обозначаем места вырезов по форме наших блистеров. Вырезаем их канцелярским ножом.



3 На белом листе намечаем участки, которые будут видны через блистеры. "Примеряем" друг к другу все детали. Вырезы крафт-листка прикрывают края блистера? Сам листок лежит на белой основе там, где вы задумали? Можно продолжать!



4 На белом листе тонируем акварелью "по мокрому" участки, которые окажутся за "окошками". Верхний стилизуем под ясное небо, нижний — под реку и берег.



5 Приклеиваем детали. В верхнем "окошке" поплывут облака из ваты, в нижнем вырастут тростник и цветы. Сюда же добавим песка и камешков.





6 Примеряем блистеры. Если мешает какой-то камешек — убираем, подрезаем слишком длинные стебельки. Теперь "окошки" можно приклеить.

7 А поверх всего этого приклеиваем финальный слой — крафт-листок с прорезями. На нем можно заранее написать любую фразу или дату создания открытки.



Наша работа — лишь пример для вашего вдохновения. За "окошком" вы можете разместить что угодно — кусочек морского побережья или подводный мир с ракушками; лесную тропинку, усыпанную еловыми иглами; веточку с ягодами (просто засушите их). Конструкция открытки с "окошками" — надежное место хранения ваших летних впечатлений.

Вера КЮЛЛЕНЕН,
сотрудник детской научной студии "Эколаборатория"
Фото автора

БЯРОЗКА
Светам кіруе той, хто чытае

На Купалле

Сонца села за гарою,
Ў небе зоркі зяюць.
Льюцца песні над ракою,
Вянкі адплываюць.

А дзяўчаты-прыгажуні
Сёння быццам ружы,
Апрануты у касцюмы,
Вытканыя ў сцюжу.

Вышывалі рукі маці
Узор адмысловы,
На спадніцы і кашулі -
Арнамент мясцовы.

Фартух зяе белізною
З яркаю аздобай,
Стан абвіты паясочкам
З доўгаю махрою.

Ночка цешыцца з расою,
Сэрца замірае.
Плыве песня над вадою,
Агонь дагарае.

Анастасія КУЛІКОВА,
СШ №28, г. Гродна



Успаміны маленства

Люблю бацькоў, іх родны кут,
Дзе чуеш часам голас продкаў.
Так добра, так утульна тут!
Бабулі хата — ты знаходка!

І я сюды прыеду зноў,
І буду слухаць тут зязюлю
Ў кустах чаромхі за ракой,
Дзе агародчыкі з цыбуляй.

Аляксей ЯКІМОВІЧ,
СШ №28, г. Гродна

Старонка мая родная

Старонка мая родная,
Куточак мой рамонкавы!
Ты — птушка белакрылая,
Крынічка гаманлівая.

Люблю цябе, ласкавая,
Красуня сінявокая,
Ты — зорка зіхатлівая,
Матулечка пяшчотная.

Старонка мая мілая,
Ў жыцці маім адзіная,
Ты — песня недапетая,
Душой маёй сагрэтая!

Анастасія КУЛІКОВА,
СШ №28, г. Гродна

У мірным краі люба жыць

У мірным краі люба жыць
І слухаць ветру казкі,
У госці да сяброў хадзіць,
Збіраць на лузе краскі.

Як напамін ахвяр вайны,
Галосяць жудасна званы.
Лунаюць ў воблаках буслы —
Жыцця шчаслівага паслы.

"За гоман летніх навальніц,
За ціхі шэпт дубровы
Табе, Радзіма, наш паклон!" —
Нашчадкі шэпчуць словы.

Бо ты — зямля нашых дзядоў,
Ты — мірная краіна,
Сваіх дачок, сваіх сыноў
Да сэрца прытуліла.

Зямля без полымя вайны,
Зямля дабра і цішыні.
Хай сонца ярка свеціць!
Мір крочыць па планеце!

Анастасія КУЛІКОВА,
СШ №28, г. Гродна

Мой родны горад

Я з захапленнем раскажу пра Гродна,
Бо я люблю яго усёй душой!
Няма сцяжынкі ў горадзе ніводнай,
Дзе б не блукала я любой парой.

Люблю Гародню і зімой, і ўлетку,
Тут адчуваю радасць я заўжды.
Кажу я "дзякуй" гораду за гэта,
Што тут няма ў мяне бяды.

Які прыгожы старажытны Гродна!
Нясе няспешнасць Нёман скрозь гады...
І я пражыць сваё жыццё тут згодна,
Бо сэрцам Гродна — вечна малады!

Любоў ГРЭСЬ,
СШ №28, г. Гродна



Жытняя Баба

Жылі побач два суседы. Адзін быў добры, другі — злосны. Злосны чалавек усяляк намагаўся нашкодзіць добраму. То плот зламае, то курку якую скрадзе. А добры чалавек і не ведаў, хто гэта чыніць, бо той нягоднік умеў маскіравацца. Так яны і жылі.

Аднойчы злосны чалавек надумаў загубіць добрага. Прыйшоўшы ўначы на поле, ён схапіў жмуток калоссяў, скруціў яго і прамовіў страшныя праклёны. Гэта называецца "залом". І таго, хто яго возьмецца выдзіраць, абавязкова ліхая доля напаткае — кожны ў вёсцы ведае. І вось задаволены злыдзень меўся ўжо сыходзіць, але раптам перад ім з'явілася Жытняя Баба.

— Ах ты нягоднік! — пагрозліва мовіла яна. — Навошта ты загубіць хочаш добрага чалавека?

— А табе што?! Хай загіне пакутлівай смерцю. Ды я цябе і не баюся, бо ты мне нічога не зробіш! — хоць і спалохаўся, заверашчаў злыдзень.

— Калі ты гэтак, то я ператвару цябе ў пацука, — паківала галавою Жытняя Баба. — Паглядзім, як табе цудоўна зажывецца.

Сказала яна ды гэтак і ўчыніла. За хвіліну з чалавека ўтварыўся пацук — шэры, з хвастом. Але нягледзячы на гэта, пацук-злыдзень не адступіўся ад сваёй мэты. Па пэўным часе ён скіраваўся да вогнішча, што палілася па-за хатаю добрага чалавека, схапіў жарынку і хуценька пакаціў яе ў бок хаты. Але зноў з'явілася Жытняя Баба і патушыла агеньчык. Тады яна ўгневаным голасам сказала:

— Бачу я, што табе навука мая на карысць не пайшла. Значыць, станешся ты чалавекам. Толькі — саламяным. На цябе будуць сядаць птушкі, а людзі будуць смяяцца.

Чалавек-пацук крычаў, румзаў, але нічога не дапамагло. Так з'явілася пудзіла, зробленае Жытняй Бабай са злоснага чалавека. І ўвесь свой век яно вымушана стаяць пасярод поля.



Альжбэта МАЛІШЭЎСКАЯ-СПРЫНЧАН, гімназія №23, г. Мінск

Ліпеньская раніца

Як спявае зранку салавей!
Дождж заснуў з вясёлкаю ў абдымку.
У суквецці ліпавых вачэй
Промень затрымаўся на хвілінку.

Патанула буслава гняздо,
Шлюбны вэлюм ліпка прымярае.
Сінь нябёс — бяздоннае акно!
Водар гэткі — аж душа спявае!

І заўжды так будзе. З году ў год
Лета у вандроўку запрашае,
Рос світальных дзіўны карагод
Ліпеньская раніца вітае.

Любоў ГРЭСЬ, СШ №28, г. Гродна



Малюнкі Яніны ВАХОВІЧ

Шчасце

Шчасце — гэта ты і я,
Шчасце — гэта ўся сям'я.
Шчасце — гэта смех дзяцей,
Позірк матчыных вачэй.

Шчасце — гэта родны дом,
Шчасце — гэта мірны сон.
Шчасце — гэта звон царкоўны,
Такі дзіўны, непаўторны.

Шчасце — гэта стары клён,
Шчасце — гэта мірны сон.
Шчасце — гэта маладосць,
Лёгкасць, спрытнасць, прыгажосць.

Аляксей ЯКІМОВІЧ, СШ №28, г. Гродна

КРАЯВІДЫ МАЛОЙ РАДЗІМЫ

Шаноўныя сябры! Наш часопіс распачынае новы этап конкурсу "Краявіды малой радзімы". Мы чакаем ад вас фотаздымкі, а таксама вершы і замалёўкі, у якіх вы раскажаце пра сваю малую радзіму. Вынікі конкурсу мы падвядзем, як заўсёды, у канцы года. Пераможцаў чакаюць прызы і падарункі. Дасылайце свае работы на адрас: 220034, г. Мінск, вул. Захарава, 19 ці на e-mail: pryroda@zviazda.by.

А сёння ў аб'ектыве фотакамеры — ліпеньская Дзяржыншчына, якой яе ўбачыла Наталія Трацэўская. На яе здымках — цудоўныя імгненні летняй раніцы, калі прырода, разбуджаная першымі сонечнымі промнямі, трапятліва замірае ў чаканні новага дня.










На зыходзе начной пары
Заіскрыліся росамі ростані,
І дарога, і дуб стары —
Усё у россыпах.

Ападае раса наўкол
Лёгкім вэлюмам,
І скаціўся яблык на дол
Поўняй спелаю.

Затрапечацца далягляд
Лёгкай птушкаю,
І разбуджаны досвіткам сад
Ветрык ціха загушкае...







Фота Віктара КАЗЛОЎСКАГА

“На том дубе арол звіў кубло бяздоннае”, або Арол — пасланнік багоў

У багатай міфапаэтычнай спадчыне беларускага народа існуе стагоддзямі выверaная сістэма сацыякультурных каштоўнасцяў, якая абапіраецца на спалучэнне супрацьлегласцяў (дабро — зло, жыццё — смерць) і вызначэнне адпаведных прыярытэтаў, калі не сказаць — на ўнікальную шкалу іерархій. Унікальнасць яе ў тым, што, размяшчаючы птушак па памерах, народныя ўяўленні тым самым не памяншаюць і не павялічваюць іх культурны патэнцыял. У кожным выпадку падкрэсліваецца своеасаблівасць і непаўторнасць той або іншай істоты, яе месца ў працэсе стварэння свету і, адпаведна, фенаменалогія міфа-рытуальнай запатрабаванасці для жыццядзейнасці чалавека. У адным з артыкулаў мы адзначалі, што царом сярод паднябеснага птаства прызнаны воран. Аднак па шкале іерархіі птушынага коду папярадзе усіх знаходзіцца арол.

Хто галоўны на троне?

Каб патлумачыць такую суаднесенасць паміж статусна высокімі персанажамі міфалогіі, неабходна яшчэ раз звярнуцца да самага таямнічага жанру духоўнай культуры беларускага народу — замоў. Сярод іх існуе цэлы сегмент твораў і матываў, скіраваных на лячэнне хвароб хатняй жывёлы. Напрыклад, у адным з тэкстаў народны лекар мадэліруе наступную сітуацыю: “На моры, на лукамор’і стаіць дуб на дванаццаць какатоў, на тых какатах дванаццаць гняздоў, у тых гняздах дванаццаць вараноў. Вараны, вараны! Прылятайце к етай скаціні з помаччу...”. А ў другім тэксце гэты ж матыў падаецца крыху іначай: “На сінім моры стаіць дуб на дваццаць восем сукоў, на тым дубі сядзіць арол на дваццаць восем вачэй, на дваццаць восем вушэй — далёка відаець, далёка ➤

слыхаець і раба божага ад патніцы і ад чамярыцы помачы даваець...". На першы погляд здаецца — гэта простая падмена вобразаў і тых адрасантаў, якія могуць (або павінны) аказаць дапамогу свойскай жывёле. І ўсё ж давайце больш уважліва прыгледзімся да напісанага і прыслухаемся да дэталяў.

Воран Варановіч — цар птушак, а гэта значыць, намеснік Бога на зямлі з адпаведнымі атрыбутамі ўлады і дакладна акрэсленай прасторай уладарання. А вось міфалагема арла больш дэталізаваная: у яго "дваццаць восем вачэй" і "дваццаць восем вушэй", што, безумоўна, указвае на сімволіку Месяца, а таксама падкрэслівае яго ўсяведанне: ён усё бачыць і ўсё чуе. Гэтыя найважнейшыя дэталі даюць магчымасць зразумець прынцыповае адрозненне паміж воранам і арлом. У найменнях арла ў розных мовах індаеўрапейскай сям'і пераважаюць тры вызначэнні: паветра, паток, мора (вада). У такім разе ёсць усе падставы прызнаць за ім родавае найменне ўсяго птушынага царства, гэта, калі хочаце, птушка птушак. А ўжо адсюль напрошваецца выснова, што мы маем справу з дэміургам, адным з творцаў Сусвету. А калі так, то зразумела, што арол як міфалагічная постаць — гэта птушка, якая наўпрост кантактуе з галоўнымі небажыхарамі — багамі. Арол не трапіў у сонм славянскіх багоў, аднак стаў іх пасланнікам, медыятарам, пасрэднікам паміж светам людзей і Паднябессем. А гэта ўжо не царская пасада і зусім іншы міфа-рытуальны статус з пэўным спектрам функцый культурнага героя. Адпаведна, і спосабы ўздзеяння на чалавека або хатнюю жывёлу могуць быць не проста іншымі, а прынцыпова іншымі. Нашы продкі мыслілі не толькі катэгорыямі матэрыялізаванага свету, але здольныя былі выкарыстоўваць і энергетычны патэнцыял духу, духоўнасці і крэатыўнай энергіі самога статусу нябеснага пасланніка. Прынцып падабенства пакладзены ў аснову методыкі (выкарыстаем надзвычай дакладнае рускамоўнае вызначэнне) "целительства": "На сінім моры, на чыстым полі стаяў дуб без карэння, без карчэўя, без макушкі і без галля. І на етам дубе сядзеў арол без галавы, без какцей, без пер'я, без крылля. Як етаму арлу па свету не лятаць, так у етай скаціны, чорнай шарсьціны... хваробы не бываць".

Зразумела, што пасланнік багоў, прылятаючы ў сферу сакральнай прасторы чалавека, атаясамліваўся з асобай царскага рангу. Менавіта таму ў архаічных па сваім паходжанні замовах і адбываецца ўзаемазамяшчэнне трох статусна тоесных персанажаў: часцей за ўсё арол дзеліць трон з воранам і значна радзей — з яструбам або сокалам. Вядомая замова, у якой апошняя птушка прэтэндуе на царскі трон, аднак арол аднаўляе карціну ўстойлівай светабудовы: "На востраві на Каяні бел камень ляжыць, на том камяні кедрава дрэва стаіць. Сокал прылятае — гняздо зьвівае, арол прылятае — гняздо збрасая".

Герой міфаў

У міфалогіі многіх народаў свету арол таксама займае важнае месца. Так, у старажытнагрэчаскіх міфах ён паўстае свяшчэннай птушкай вярхоўнага бога Алімпу Зеўса, а ў старажытнарымскіх — Юпітэра. У старажытнагрэчаскай міфалогіі ўвасабленне душы чалавека — Псіхея — падаецца ў вобразе менавіта арла, постаць якога імкнецца ў вышыню. Мы пастаянна падкрэсліваем, што ў міфапаэтычнай спадчыне кожнага народа існуе выразная запаралеленасць культурных кодаў. Дык вось душа чалавека часта супастаўляецца з Месяцам. А чарадзейная ірландская казка расказвае пра тое, як герой заблудзіўся ў балоце і ўжо не спадзяваўся выбрацца адтуль. Раптам з Месяца зляцеў арол і прапанаваў яму сесці на спіну, аднак замест таго, каб апынуцца дома, герой трапляе на Месяц. Такім чынам атрымліваецца, што арол Паднябесся ёсць не што іншае, як увасабленне спадарожніка Зямлі.

Важнае месца арол займае ў рускай этнакультурнай традыцыі, дзе ён выступае як змеяборац, які нясе людзям святло і дабро. Акрамя таго, ён з'яўляецца сімвалам царскай дзяржаўнасці і непераможнасці. Так, двухгаловы арол размяшчаецца на гербе Расіі з 1472 года, з часу жаніцьбы Івана III на пляменніцы апошняга візантыйскага імператара Канстанціна XI Соф'і Палеалог. Гісторыя двухгаловых арлоў пачынаецца ў сівой даўніне — у II тысячагоддзі да н.э. Вытокі вобразу могуць азначаць астральную сімволіку, якая знітавала ў адзінае цэлае Сонца і Месяц. Зусім не выключана, што за гэтым арлом хаваецца і культ блізнятаў. Аднак бадай што найбольш выразныя паралелі напрошваюцца паміж двухгаловым арлом і двухаблічным Янусам, які быў увасабленнем Часу. Адна яго постаць была скіравана ў бок мінулага году, а другая — у дзень заўтрашні, у новы год. У больш познія часы, калі Расійская імперыя пашырыла межы сваёй тэрыторыі, дзве галавы арла, скіраваныя ў розныя бакі, сталі сімвалізаваць арганічную паяднанасць дзвюх цывілізацый — усходняй (азіяцкай) і заходняй (еўрапейскай).



Двухгаловы арол на гербе Расіі размяшчаецца з 1472 года.



Зеўс (Юпіцер) і арол.



У міфалогіі арол і Месяц цесна ўзаемазвязаныя паміж сабой.



Фота БЕЛТА

Вялікую цікавасць для нас уяўляе скандынаўскі міф, у якім падаецца дахрысціянская карціна свету. На самай вершаліне сусветнага дрэва — у дадзеным выпадку ясеня — сядзіць мудры арол, паміж вачыма якога знаходзіцца стары ястраб. Пад кронай гэтага дрэва месціцца ўвесь свет, а каля каранёў знаходзіцца свяцілішча саміх багоў.

Птушкі высокага палёту

Для канчатковага завяршэння разважанняў пра месца арла ў міфапаэтычнай карціне свету нам патрэбна ўзгадаць яшчэ адну казку — "Сястра і браты-арлы". Яна фактычна з'яўляецца кароткай энцыклапедыяй міфарытуальнай сістэмы каштоўнасцяў, а яе дэталёвы аналіз раскрывае перад намі шматлікія аспекты шкалы каштоўнасцяў славянскага абрадавага этыкету. Казка распавядае: жылі дзед з бабай, і было ў іх трое сыноў. На вялікае свята баба пайшла з імі ў царкву. Там яны пабіліся паміж сабой. Матка ўбачыла гэта і сказала: "Ах, каб вы, мае сыночкі, так цэлы век свой біліся, як вы цяпер б'яцёсь!". Ператварыліся яны ў птушак ("Свайго ёй слова не вярнуць!"). Праз дзевяць гадоў у бабы нарадзілася дачка. Выросла яна, а людзі расказалі дзяўчыне, што ў яе ёсць тры браты. Адправілася яна ў далёкі шлях, "відзіць перад сабой бальшую хату". Увайшла і ўбачыла на стале талерку, лыжачку і скібачку хлеба. Яна пачаставалася і схавалася за печ. Прылятаюць тры птушкі: "Як ўляцелі, скінулі з сябе пер'е і сталі такімі малойцамі!". Паелі, зноў перакінуліся ў птахаў і паляцелі біцца крыламі. Так паўтаралася тры дні. За трэцім разам дзяўчына вылезла з-за печы і прызналася, што яна іх сястра, а дома іх чакае матка. А яны ў адказ: "Тады мы будзем твае браты і пойдзем дамоў, як ты адбудзеш тры гады немай!". Занеслі браты яе ў пушчу і кінулі там. Аднаго дня там паляваў кароль, знайшоў дзяўчыну, закахаўся і ажаніўся з ёй. Праз тры гады задумала свякруха спаліць прыгажуню на агні, аднак тры спробы кінуць яе ў агонь аказаліся безвыніковымі. А тут і браты прыляцелі, падняслі яе на крылы і панеслі дадому.

Казка гэта — адзін з раздзелаў абрадава-этыкетнага падручніка народу. Яна распавядае пра тое, што ў святочны час і ў свяшчэнным месцы паводзіны чалавека павінны адпавядаць выпрацаванай этнасам сістэме рэгламентацый. Непаслухмянасць дзяцей, у сваю чаргу, прывяла да таго, што маці не стрымалася і пракляла іх. А праклён матулі так проста не вернеш. І тады на дапамогу братам адпраўляецца сястра, якая на працягу трох гадоў павінна заставацца "немай", гэта значыць — не прамовіць ніводнага слова. Праклён можна "адпрацаваць" толькі складанымі і працяглымі выпрабаваннямі. І яшчэ адна прынцыпова важная акалічнасць. Сям'я, пра якую распавядае казка, незвычайная. Гэта сям'я чарадзеяў, знахараў, валхвоў, таму што толькі яны валодалі таямніцамі пераўвасаблення і ператварэння з адной формы існавання ў іншую. А пра тое, што валхвы гэтыя былі "высокага палёту арлы", сведчыць той факт, што на паляванне адпраўляецца сам кароль. Статуснасць сацыяльная (каралеўская асоба) падкрэслівае духоўнае становішча арлінага сямейства.

Усе гэтыя акалічнасці сталі асновай таго, што міфалагема птушкі птушак адлюстравана ў сакральнай геаграфіі і прозвішчах славянскіх народаў: горад і рака Арол, прозвішчы людзей — Арол, Арлоўскі. Сюды ж трэба дадаць мянушку каня — Орлік. Цікава адзначыць і тое, што ў птушыным кодзе славян арол і воран знаходзяцца побач, таму, напэўна, зусім невыпадковым з'яўляецца і тое, што гарады Варонеж і Арол таксама размешчаны па суседстве.

Такім чынам, персаніфікацыя птушынага коду міфапаэтычнай спадчыны беларусаў дае падставы сцвярджаць, што на вяршыні гэтай піраміды знаходзіцца птушка птушак — арол. Таму зусім невыпадкова ў звярыным кодзе ён стаіць на адной прыступцы з мядзведзем і ваўком.

Аксана КАТОВІЧ

Скульптура арла ў аднайменным расійскім горадзе.



“Я люблю гэтыя прасторы!” — можа ўсклікнуць услед за класікам мастак, якога на творчасць натхняюць толькі родныя беларускія краявіды.

Яго архітэктурна-пейзажны жывапіс часам называюць ідэальным — без гвалту натоўпу, мітусні гарадоў. Дык можа і сам мастак Іван Козел проста ідэаліст? На гэта маё пытанне, а гутарым мы ў майстэрні, у інтэр’еры няяркіх і вельмі цёплых работ жывапісца, ён сціпла ўсміхаецца і гэтак жа сціпла фармулюе: “Я заўсёды і ва ўсім шукаю гармонію”.


“На Ракуцёўшчыне лета”.

“На прастор, на шырокі прастор”

Прыхільнасць да гарманічнага жыцця — адметная рыса вяскоўцаў — у Івана Мікалаевіча выхоўвалася пакрысе. З паходаў у лес па грыбы-ягады, на рэчку ды азёры — паплёскацца ды парыбаліць. Спачатку ў вёсцы Нёўда Наваградскага раёна, потым на Дзятлаўшчыне, куды сям’я пераехала. А яшчэ з назірання за спрытнымі рукамі маці і бабулі, што пралі посцілкі і рушнікі доўгімі зімовымі вечарамі. Дарэчы, Дзятлаўшчыне, дзе Іван вырастаў і дзе цвёрда вырашыў стаць прафесійным мастаком, ён прысвячае зараз шмат работ, прывозіць туды і цэлыя выставы. Адну так і назваў: “Зямля мая — зямля бацькоў”.

“Прырода для мяне — натхненне і падказка”, — гэта ўжо цытата з нашай размовы аб тым, як нараджаецца сюжэт пейзажа ці карціны. Мастак любіць пленэры, асабліва на сваёй радзіме. Робіць замалёўкі, эцюды. Потым у майстэрні ідзе больш грунтоўная работа алеем на палатне. Але здараецца, што па дарозе на працу, а Іван Мікалаевіч яшчэ і выкладае ў гімназіі-каледжы мастацтваў імя Ахрэмчыка, ён бачыць нешта такое ў прыродзе, што імчыцца з эцюднікам у свой любімы Лошыцкі парк...

Сябра Беларускага саюза мастакоў, удзельнік больш як паўсотні айчынных, замежных і аўтар амаль дзясятка персанальных выстаў, Іван Козел застаецца верным свайму крэда рэаліста: ніколі слепа не пераймаць прыроду і не капіраваць натуру. Спецыялісты сцвярджаюць, што мінімумам сродкаў яму ўдаецца раскрыць тэму і расказаць пра важнасць ідэі гарманічнага суіснавання чалавека і прыроды.

У пейзажах гэтага мастака вельмі адчувальная нацыянальная мастацкая традыцыя, сцвярджае кандыдат мастацтвазнаўства Галіна Горава. І дадае, што калі характарызаваць яго творчасць, то цяжка пераадолець спакусу разглядаць яе “як люстэрка пейзажнага жывапісу Беларусі”.


Памятаеце, як гучаць далей купалаўскія радкі, што цытуюцца напачатку гэтага артыкула: “На прастор, на шырокі прастор! Я люблю гэтыя прасторы, люблю неаглядныя ружова-сінія далі іх, поўныя жыцця, малюнкавасці, разнастайнасці тонаў зямлі і неба, дзе так многа разгону для тваіх вачэй, і дзе маўклівая далечыня, атуліўшыся танюсенькай наміткаю сінечы, думае нейкую адвечную сваю думку...” Прыгледзьцеся: ці не тое ж на гэтых палотнах?

Лідзія ПЕРАСЫПКІНА


“Ля калодзежа”.


“Дзятлаўская старонка”.


“Старая Лошыца”.


“Возера ля вёскі Явар”.



Начало лета. В небе поют жаворонки, выделяясь только им свойственным “ки-ги”; резко изменяя траекторию полета, носятся чайки; в поисках пищи бегают у воды кулики. А на воде, собравшись компанией, отдыхают самцы уток. Насытившись малыми рыбешками да земноводными, они ожидают своих поклонниц.

Фото Андрея ФЕОКТИСТОВА

Пернатая актриса

Солнце поднялось выше. Клев рыбы сначала замедлился, а потом и совсем затих. Я упаковал снасти и направился домой. Переувлажненная почва хлюпала под подошвами резиновых сапог. Поднялся выше, на суходол. Идти стало легче, несмотря на то, что в одной руке — рыболовные снасти, в другой — достаточно неплохой улов.

Незаметно приблизился к заводи. На мелководье тянула вверх свои стебли водная растительность. Невдалеке от берега, выделяясь блеклостью, лежала прошлогодняя сухая трава. Свежей зеленью ее окаймляла молодая луговая поросль.

Весенняя красота поражала и восхищала. Я отвлекся, сделал несколько небольших шагов. И вдруг впереди, примерно метрах в пяти, что-то сильно захлопало. От неожиданности сердце предательски дрогнуло. Из прошлогодней травы, шумно махая крыльями, взлетела утка. В воздухе закружились мелкие легкие пушинки, которые в безветрии плавно опускались на луговой ковер. Более крупные, поднятые воздушным потоком, немного полетали и вскоре тоже опустились на траву.

Я понял, что у птицы здесь гнездо. И надо же было нарушить ее покой...

Пролетев несколько метров, утка опустилась. Выбросила растянутое левое крыло на траву, легла на правый бок, пристально глядя в мою сторону. Я повернулся к ней и сделал шаг вперед.

Птица заметила мой маневр. Оттолкнулась и, хлопая крыльями, подражая подранку, снова попыталась взлететь. Преодолев несколько метров, она упала, все так же вытягивая левое крыло. Я стоял и с сочувствием смотрел на нее. Решил не беспокоить, как мне показалось, раненую пернатую, и собрался уходить. Утка, очевидно, поняла мое намерение. Она вмиг подобрала крыло, повернулась на животик, оттолкнулась и легко, на этот раз бесшумно, взлетела. Не набирая высоты, пролетела немного, а достигнув заводи, прочертила оранжевыми лапками зеркальную гладь, напугав греющихся на солнце мальков, и остановилась. Опустив клюв воду, она не переставала следить за мной.

Ай да утка, ай да луговая актриса! Как искусно отводила чужака от своего гнезда!

Чтобы успокоить птицу, я, оглядываясь, уходил дальше. Через несколько минут утка подплыла к пологому берегу и поднялась на небольшую возвышенность. Она целеустремленно, уже не обращая на меня внимания, шла к своему гнезду, к будущим птенцам, которые, вылупившись, пополнят утиную семью.

Николай КОЛЯЧКО



Фермерское хозяйство “СидСад” занимается выращиванием овощей, пряных трав, голубики высокорослой уже более десяти лет. Вся продукция имеет сертификат публичного учреждения “Ekoagros”, не содержит ГМО, синтезированных консервантов, химических красителей и ароматизаторов. Этим экологически чистым хозяйством руководят супруги Елена и Виталий Сидоровы. Они придерживаются исключительно принципов экологического земледелия и используют технологии, позволяющие полностью отказаться от химикатов и минеральных удобрений.



Американская ягода в “белорусской Швейцарии”

Начало “голубичного пути”

Начиналось все в 2008 году, когда супруги приобрели землю в д. Дашки Минского района. Как признается Елена Сидорова (бывший младший научный сотрудник, инженер-гидролог, проходила обучение в Санкт-Петербурге), это был очень рискованный шаг, особенно если учесть, что на земле решили работать городские жители, у которых не было ни опыта, ни аграрных знаний:

— В деревне нас приняли снисходительно, но скептично. В успех нашей деятельности никто не верил, поскольку от этой холмистой земли до нас многие отказывались. Но мы были покорены красотой этих мест и твердо решили обосноваться. Кстати, одни из наших гостей назвали эти края “белорусской Швейцарией”. Вначале было непросто: мы четыре года прожили в вагончике: в одной половине — я и муж, в другой — рабочие. Кроме того, мы делали много ошибок при выращивании. Но справились, и я могу сегодня сказать, что от многого в жизни можно отказаться ради идеи.

Сначала Сидоровы нанимали работников из деревни, теперь в хозяйстве работают 12 человек приезжих. Фермеры признаются, что в сельском хозяйстве нужно жесткое руководство, поскольку существуют проблемы с алкоголем и воровством. Тем не менее, супруги положительно отзываются о людях, с пониманием относятся к их проблемам, отмечают, что в деревне до недавнего времени было два долгожителя (остался один), которые перешагнули столетний рубеж:

— Говорят, у нас “жирный воздух”, и в этом что-то есть. В деревне, окруженной со всех сторон лесом, кажется, жить полезно для здоровья, — продолжает Елена Сергеевна. — Мы впервые попробовали голубику в 2008 году в Голландии и буквально влюбились в эту ягоду. Решили заняться ее выращиванием в Беларуси. Тем не менее, места для нее оказались здесь неблагоприятными.



родная природа

Виталий Григорьевич добавляет:

— Мы не могли получить ответ, как правильно выращивать голубику в наших условиях. Сначала я сделал поле без отбойника, после дождей пошли стоки воды, да еще и овраги намыло. Природа нас испытывала, после того сезона таких дождей не было. Пришлось делать все заново, завозить землю, торф. Вверху сделал отводной канал. 10 раз я переделывал это поле.

Зарубежный опыт

Сегодня голубичными плантациями "СидСада" занято 11 га земли. Процесс их "распространения" идет постепенно: последние 3 га заняты двухлетними небольшими кустиками. Фермеры делают все своими силами, без привлечения дополнительных инвестиций. Супруги владеют уникальным для нашей страны опытом выращивания этой культуры, который они почерпнули за границей, а также приобрели методом проб и ошибок.

Работая с луком на перо, Сидоровы побывали в Голландии, посмотрели на методы работы на земле, на селекцию высокого уровня. Елена признается, что в своей деятельности они не делают ничего, как учат в Беларуси, поскольку фермеры не получали отечественного сельскохозяйственного образования, а сразу заимствовали зарубежный опыт:

— Я считаю, что каждый бизнесмен должен съездить за границу, поскольку именно там сосредоточен весь передовой опыт. Нам посчастливилось побывать в Европе, США, Японии, Скандинавии. Признаюсь, что поездки оказались трудными, поскольку были сосредоточены на рабочих вопросах. Кроме того, другая языковая среда усложняла процесс общения. И все же люди нам доверились, показали и рассказали, как выращивают чистые продукты на своей земле. Эти поездки многое нам дали, сделали нас более открытыми.

В этом году супруги посетили Полесский государственный университет, руководство пригласило их провести лекцию. Судя по реакции зала (в аудитории были ученые, практики, студенты), информация, которую изложили фермеры присутствующим, была очень полезна, потому что разговор шел о практической реализации.

Полезно знать

Ягоды голубики рекомендуются при колитах, катаре желудка, они увеличивают желудочную секрецию, улучшают аппетит, укрепляют стенки капилляров, нормализуют функции кишечника, поджелудочной железы; листья повышают функциональную деятельность желудка, кишечника, сердца; ягоды и листья голубики способствуют понижению уровня сахара в крови, используются при лечении неосложненных форм сахарного диабета.

Ягоды также благотворно влияют на регулирование работы щитовидной железы. Их можно применять как профилактическое средство против инфекционных заболеваний. Голубика оказывает эффективное действие при гипертонической болезни, ревматизме, капилляро-токсикозах и ангине. Для профилактики утомления глаз в Японии пьют сок голубики (работникам, которые проводят более 4 часов в день за компьютером, дают около 100 г этой ягоды в день).






Елена Сергеевна также рассказала о том, как на Западе наука служит сельскому хозяйству. Производители обязательно платят налоги, которые идут на развитие науки. За счет этих налогов существуют филиалы различных институтов, которые занимаются исследованием и выращиванием сельхозпродукции. Специалист такого филиала обязательно выезжает к фермеру, дает консультации, сигнализирует, когда нужны какие-либо обработки. Разумеется, фермер может овладеть такой информацией самостоятельно (так поступают в Беларуси), но это лучше делать узкому специалисту. Сегодня наши фермеры вынуждены заниматься и наукой, и бухгалтерией, и сбытом, и транспортом, и многим другим. В связи с этим Елена критикует современную систему образования, считая, что наука оторвана от жизни, учеба и повышение квалификации существуют только для галочки. Необходимая информация, к сожалению, вся на английском языке, поэтому нужны специалисты высокого уровня, но они не хотят работать в деревне.

Люди обязательно должны вернуться к своим истокам, к земле. Только это вернет здоровье обществу и в прямом, и в переносном смысле. Питаясь чистыми продуктами, человек может избавиться от ряда болезней, а работая на земле, он многое осознает, идет перевоспитание и переоценка ценностей в жизни.

Ольга ПРОЛЮК
Фото автора



Исторические находки

Во время работ на земле фермерами были обнаружены российские монеты, часть расколовшегося пушечного ядра и ключи. Нахождение армейского орудия свидетельствует о многочисленных военных действиях, которые происходили на этих территориях.





Калі глядзіш на экстравагантныя паводзіны шчуркі-пчалаедкі — як яна імгненна зрываецца з галінкі, праносіцца ў паветры, нечакана кідаецца то ўверх, то ўніз, — мімаволі напрошваецца параўнанне палёту птушкі са стралой, выпушчанай з лука. Яркая вясёлкавая афарбоўка яе пер'я адлівае на сонцы золатам, іграе перламутрам, і таму шчурку часта называюць райскай птушкай.

Залацістая страла пясчаных кар'ераў



На тэрыторыі нашай краіны шчурка залацістая — так называюць птушку ў Расіі, альбо пчалаед — у Англіі і Нямеччыне, — рэдкі пералётны від. Селіцца пераважна ў пясчана-гліняных кар'ерах, свае гнёзды робіць у норах на стромкіх схілах. Накшталт ластавак-зямлянак, шчуркі жывуць калоніямі, іхнія норы для гнездавання знаходзяцца побач з норамі ластавак. У Беларусі птушкі ўзяты пад ахову, занесены ў Чырвоную кнігу. Прылятаюць пчалаедкі да нас у канцы вясны альбо на пачатку лета. Пасля непрацяглага шлюбнага перыяду пачынаюць будаваць і ўладкоўваць свае часовыя кватэры.

Мне давялося назіраць за гэтым паветраным акрабатам на адным з пясчаных кар'ераў Мінскага раёна. Чаму акрабатам? Калі прыгледзецца, акрамя жукоў, стракоз, матылёў, птушка спажывае пчол і чмялёў. Яна ловіць іх у палёце, часта ганяецца за насякомымі і па гарызонце, спрытна пікіруе і па вертыкальнай траекторыі. З дапамогай крылаў і доўгай, загнутай уніз дзюбы пчалаедка лёгка здабывае сабе ежу.



Здымаць шчурку — мара кожнага фатографа. Паводзіны, партрэты з матылямі і чмялямі ў дзюбах, а галоўнае — афарбоўка пер'я, робяць птушку "зорнай" істотай. Сапраўды, спалучэнне розных адценняў і колераў — ад бірузовага на грудцы і лбе да жоўтага на шыі і спіне, цёмна-карычневага на галаве і патыліцы да зялёнага на перадплеччы — птушыную вопратку робіць экзатычнай, казачнай.

Без малога тры тыдні працягваецца выседжванне птушанят у шчуркавых. І амаль столькі ж патрабуецца часу, каб яны падраслі, навучыліся лётаць, здабываць корм. У канцы жніўня шчуркавая калонія ўжо рыхтуецца ў дарогу — іх чакаюць далёкія і цёплыя Афрыка і Індыя.

Анатоль КЛЯШЧУК
Фота аўтара







Мед. Мифы и реальность

Часть вторая

Мы продолжаем публикацию *(начало смотрите в майском номере журнала “Родная прырода”)* распространенных мифов о меде, авторами которых являются недобросовестные продавцы либо просто некомпетентные люди.

6. Чем выше диастаза, тем качественнее (полезнее) мед

Диастаза — один из ферментов в составе меда, который может расщеплять крахмал. На этом основана относительно несложная методика его определения. Сколько кубических сантиметров 1%-ного крахмала будет за час превращено в более простые сахара, такое и диастазное число меда. Оно измеряется в единицах Готе (по фамилии французского исследователя) и условно указывает на уровень других, совместно действующих, иногда менее устойчивых ферментов. То есть говорит о степени биологической активности продукта.

Было бы слишком просто сказать: чем выше диастазное число, тем качественнее (полезнее) мед. Излишняя биологическая активность может кому-то и навредить! Диастазное же число вместе с другими показателями помогает удостовериться в том, что анализируемый образец действительно является медом. В светлых цветочных медах диастаза бывает, как правило, более низкой, чем в темных, и допускается, согласно ГОСТу Р 54644-2011, от 10 единиц Готе. Как исключение, в качественном меде с белой акации ее насчитывается от 5 единиц. В падевых и нектарно-падевых разновидностях



диастазы больше, чем в цветочных видах. В процессе хранения, а также при нагревании меда диастаза, как и другие ферменты, разрушается. Но количество диастазы/инвертазы уменьшится наполовину при температуре +10°С лишь через 12600/9600 дней; при t 20°С — через 1480/820 дней. При t 60°С мед потеряет половину диастазы/инвертазы чуть больше, чем за 1 день/4,7 часа, при t 80°С эти превращения произойдут за 1,2 часа/8,6 минут соответственно. Потому по диастазе еще определяют, что мед хранился в надлежащих условиях, не подвергался термической обработке и сберег свои полезные свойства.


7. Мед — продукт калорийный, потому его стоит избегать полным людям и тем, кто худеет

Мед — продукт не самый калорийный и, главное, менее калорийный, чем сахар. Для сравнения: кукурузные хлопья — 372 ккал/100 г, овсяные — 358, колбаса вареная “Докторская” — 257, колбаса сырокопченая “Любительская” — 511, черный хлеб — 201, сыр голландский — 352, сдоба — 318, баранки — 342, мед — 312, сахар — 377 ккал/100 г.

Конечно, если только накапливать калории и не стремиться их потратить, они обязательно где-нибудь да создадут неприятные на вид наслоения. Но зная ценные свойства меда, вы будете употреблять его в нужное время и в нужном количестве. Тогда вкусное лакомство даст хорошую подпитку вашему организму, поможет укрепить ваше здоровье и нормализовать обмен веществ.



rosa-tv.com



8. Мед нельзя употреблять при диабете, а также аллергикам

Еще не так давно врачи однозначно исключали мед из рациона диабетиков. Сегодня некоторые его виды, в которых больше фруктозы, чем глюкозы, могут быть рекомендованы им для употребления. Больше всего фруктозы содержит акациевый мед. Полноценным он будет в Украине. В Гомельской и Брестской областях акации меньше, чем у наших соседей, но разнотравье с местной акацией тоже может не вызывать проблем. Помимо акациевого, фруктозы больше и в темных видах меда.

Если аллергия не вызвана повышенной чувствительностью к продуктам пчеловодства, то поиск **своего** вида меда нужно начинать со светлых сортов. Как правило, они менее сложны по составу. И в результате — менее аллергенны.



9. Настоящий мед всегда кристаллизуется

Мед цветочный — любой, полученный из нектара цветов, — рано или поздно кристаллизуется. Рапсовый мед может “сесть” и за две недели. А если пчеловод его вовремя не откатал, то он может затвердеть даже в сотах. Кристаллизация других видов может закончиться через два месяца, через полгода и даже более.

На кристаллизацию меда влияют:

1. Состав. Мед, в котором больше фруктозы, дольше остается жидким. Обычно он имеет более темный оттенок. Раньше кристаллизуется мед из растений, которые дают больше глюкозы, чем фруктозы. Чаще он со светлым оттенком. Быстро “садится” мед, в составе которого много мелких пыльцевых зерен, таких, например, как у одуванчика. Падевый мед (он получается сейчас в основном из соков деревьев: лиственных пород — светлее, хвойных — темнее) может оставаться жидким даже до следующего сезона. Нектарно-падевый мед кристаллизуется дольше, чем цветочные виды.

2. Тара, в которую мед разливается. Дольше не кристаллизуется он в стеклянной и эмалированной посуде.

3. Температура хранения. Если она ниже 15°С, процесс кристаллизации ускоряется. В холодильнике быстрее “сядет” любой мед.

10. Настоящий мед всегда имеет яркий запах, сахарный — не пахнет

На одной из медовых ярмарок мне предлагали купить земляничный мед с запахом свежайших ягод. В другой раз разговаривал с покупательницей, которая искала крапивный мед — мол, как-то купила такой на ярмарке. Понравился ей тем, что имел запах крапивы. Как и обещал продавец, продукт не вызвал аллергии.

Благодаря чудесам химии, сегодня несложно получить мед киви, банана, огуречный и любой другой, используя красители и ароматизаторы из специальных наборов. Так легче продать мед на ярмарках, если его много, а спросом он пользуется слабо.

Но на самом деле мед, полученный с определенных медоносов, обычно имеет запах, мало похожий на аромат их цветов. Это может быть сильный, насыщенный запах, как у гречишного меда, или легкий, нежный и чуть слышный, как у киprея. В любом случае, каждый вид имеет свой особенный аромат. Ароматические вещества улетучиваются и заполняют помещение при откатке меда. Оставшиеся хорошо различимы при комнатной температуре в момент открывания емкости с лакомством. В холоде и на ветру вы можете не оценить тот богатейший букет пчелиного продукта. Правда, многое еще зависит от чувствительности вашего обоняния.

Вряд ли пчеловод, чтобы привлечь вас, станет искать способ придать более сильный запах своему меду с нежным, утонченным ароматом. Зато в этом вполне может преуспеть находчивый продавец. “Сахарность” меда по запаху определить невозможно.

Сергей МЫТЬКО,
заместитель председателя правления РОО “Белорусские пчеловоды”

Продолжение материала читайте в ближайших выпусках журнала.



eda-land.ru



Вядомая беларуская пісьменніца, аўтар бестсэлераў “Площадь согласия”, “Территория души” і “Миг бесконечности”, а таксама некалькіх зборнікаў вершаў, ужо на працягу 16 гадоў жыве ў знакамітым аграгарадку Ратамка. “Жывём, нібыта ў батанічным садзе. А якая тут раскоша для ўнукаў і нашых коткі ды сабакі!” — кажа пісьменніца. Я чамусьці ўяўляла модны дызайн участка, дзе усё такое, нібыта са старонкі глянцавага часопіса. А ўбачыла мора ружаў, утульнасць і такую добрую патрыярхальнасць.

Тэрыторыя для душы Наталлі Батраковай

— І я, і мой муж выраслі ў прыватным сектары. Потым жылі ў гарадской кватэры, і я думала, што так будзе заўсёды. Але неяк муж сказаў, што хоча будаваць дом за горадам. Не лецішча, а менавіта дом для усёй сям’і. Ведаеце, я цяпер разумею, што гэта не была даніна модзе — маўляў, дасягнуўшы пэўнага матэрыяльнага становішча, па статусу трэба мець загарадны дом. Не, гэта было іншае — патрэба быць бліжэй да прыроды, да сваіх каранёў, — распавядае Наталля.

— А вы, як дзекабрыстка, паехалі за мужам ці жылі на два дамы?

— Роўна месяц я пражыла на два дамы і зразумела, што мне гэта цяжка ды і няправільна ў адносінах да сваёй сям’і. Пераехала ў Ратамку і ніводнага разу не пашкадавала аб гэтым. Больш таго, зараз ужо не ўяўляю, як людзі жывуць у горадзе. Неяк засталася начаваць у сяброўкі, дык не магла заснуць: то ліфт гудзе, то яшчэ які грукат. Зразумела, што і дыхаецца ў мегаполісе не так лёгка, як у нас на прыродзе. Гэта такое шчасце — раніцою басанож прайсціся па расе! А як цудоўна амаль круглы год жыць сярод кветак! У нас жа тут першымі зацвітаюць пралескі і крокусы. З цягам часу я навучылася рабіць так, каб на клумбах не было “лысін”: кветкі цвітуць адны за другімі. А завяршаюць сезон хрызантэмы і познія ружы. Апошні букет я зразаю ў лістападзе і сама сабе раблю такі падарунак.



— Наталля, у вас вялікі ўчастак, шыкоўныя ружы, ставок і нават будуеце цяпліцу. Скажыце шчыра, колькі ў вас памочнікаў?

— Сапраўды, ёсць дзяўчына, якая дапамае ў маім міні-батанічным садзе. Але мы шмат што робім разам. Канешне, усё гэта патрабуе і часу, і намаганняў, але калі ты любіш свой лапік зямлі, сваю ружовую алею, то даглядаць за гэтым ужо не цяжкая праца, а задавальненне. Да жадання паставіць цяпліцу трэба было “дарасці”, я шмат чытала пра тое, як ёй карыстацца. Трэба было даць сабе шчыры адказ на пытанне, ці хопіць у мяне на гэта часу і жадання. У нас, як бачыце, няма вялікага агароду, але 2-3 градкі з зелянінай, агуркамі, рукалай робім. Цяпер вось і цяпліца з таматамі ды іншай гароднінай дабавіцца.



